**Урбан, В. В.** Ідыёма / В. В. Урбан // Культура Беларусі : энцыклапедыя. Т. 4. / рэдкал.: У.Ю.Аляксандраў (гал. рэд) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П.Броўкі, 2013. – С. 171 – 172.

**ІДЫЁМА** (грэч. idiōma – адмысловы, своеасаблівы выраз) у мовазнаўстве, 1) семантычна непадзельнае ўстойлівае фразеалагічнае словазлучэнне, значэнне якога не залежыць ад значэння кампанентаў, што ўваходзяць у яго склад (тое, што і фразеалагічнае зрашчэнне): *цюцелька ў цюцельку, даць драпака, на святыя нігды, на ўсе застаўкі* і пад. **І.** успрымаюцца як нематываваныя з пункту гледжання сучаснай мовы бязвобразныя фразеалагізмы, якія патрабуюць этымалагічнага аналізу, высвятлення матываў іх узнікнення. У склад **І**. могуць уваходзіць лексічныя архаізмы або словы, якія не ўжываюцца за межамі фразеалагізма (*даставаць гізунты, даць чапаласу, збіваць з панталыку* і пад.). Значна радзей могуць сустракаюцца ў **І.** граматычныя архаізмы або можа назірацца адсутнасць жывой сінтаксічнай сувязі паміж лексічнымі адзінкамі (*абое рабое, як мага, кесарава кесараві, спачыць у бозе, сабе наўме* і пад.). Як правіла, у **І.** немагчымы перастаноўкі кампанентаў, а таксама іншых лексічных уставак. У мовазнаўстве адрозніваюць лексічныя, марфалагічныя і сінтаксічныя ідыёмы. 2) уласцівы толькі пэўнай мове, непадзельны ўстойлівы выраз з адзіным лексічным значэннем, які ўзнаўляецца як гатовая моўная канструкцыя і мае ярка выражаную экспрэсіўную афарбоўку (у шырокім значэнні да **І.** адносяць фразеалагічныя зрашчэнні і фразеалагічныя адзінствы). Напрыклад, уласна беларускія **І.**: *бібікі біць, даць пятлю, следам за дзедам, гады ў рады, з жабіны прыгаршчы* і пад. Крыніцамі папаўнення ўласна беларускіх **І.** з'яўляюцца жывая народная мова, дыялектная мова, прафесійнае маўленне, індывідуальна-аўтарскія выразы.

*Літ.*: Аксамітаў А.С. Беларуская фразеалогія. Мінск, 1978; Лепешаў І.Я. Фразеалогія сучаснай беларускай мовы. Мінск, 1998; Лепешаў І.Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў. Мінск, 1981; Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў. Мінск, 1990; Янкоўскі Ф.М. Беларуская фразеалогія. Мінск, 1981.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ